ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
14
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 19 (1319)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
мэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### УРАЧЫСТАЕ ЎШАНАВАННЕ

**супрацоўнікаў АГЧ—ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны адкрыў прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У. І. Сілін. Прысутных павіншавалі са святам Перамогі прарэктар па вучэбнай рабоце У. Р. Івашын і загадчык аддзела ваенна-патрыятычнага выхавання парткома І. В. Марчанка. Былі ўручаны медалі «Ветэран працы», граматы Мінскай секцыі Савецкага камітэта ветэранаў вайны, прывітальныя адрасы і прэміі. З віншаваннямі выступілі камсамольцы і моладзь універсітэта.**

**А. ЦВЯХ.**

### САВЕТ ДРУЖБЫ

**універсітэта арганізаваў і правёў камуністычны суботнік, прысвечаны барацьбітам Фронту нацыянальнага вызвалення імя Фарабунда Марці. Сваю салідарнасць з сальвадорскімі патрыётамі прадэманстравалі разам з савецкімі студэнтамі члены зямляцтваў В'етнама, ГДР, Кубы.**

**Л. ЛІННІК,**
**прэзідэнт савета дружбы.**

### ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ

**таварыства «Веды» Белдзяржуніверсітэта «Аб задачах арганізацыі па прапагандзе матэрыялаў і рашэнняў XXVI з'езда КПСС» адзначыў заслугі лектараў і іншых ідэалагічных работнікаў універсітэта ў галіне распаўсюджання палітычных ведаў, зацвердзіў план мерапрыемстваў па растлумачэнню і прапагандзе матэрыялаў і рашэнняў партыйнага з'езда, а таксама зварот членаў таварыства «Веды» БДУ да вучоных, выкладчыкаў ВНУ, работнікаў навукова-даследчых устаноў горада-героя Мінска прыняць дзейсны ўдзел у гэтай рабоце сярод працоўных калектываў прамысловых прадпрыемстваў і па месцы жыхарства.**

**Л. КЛЯУС,**
**адказны сакратар таварыства «Веды».**

### НАРОДНЫ ХОР

**выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта запрашае ўсіх аматараў харавых спеваў. Рэпетыцыі жаночай групы хору кожны панядзелак і кожную сераду; мужчынская група збіраецца ў сераду.**

**Г. МАРЦІНКЕВІЧ,**
**старшыня культмасавай камісіі мясцкома.**

● СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ

## На крылах рашэнняў партыі

ПРАЙШОЎ сход актыву камсамольскай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. У ім удзельнічалі члены камітэта камсамола універсітэта, камітэтаў камсамола факультэтаў, сакратары камсамольскіх бюро курсаў, патокаў, кафедраў, камсоргі груп.

На сходзе са змястоўным дакладам «Аб выніках XXVI з'езда КПСС і задачах камсамольскай арганізацыі універсітэта, якія выцякаюць з рашэнняў з'езда і даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева» выступіў дэлегат XXVI з'езда КПСС, рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР У. А. БЕЛЫ.

У спрэчках па дакладу выступілі намеснік сакратара камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта В. ЖУК, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта А. ГАРАЛЁВА, намеснік сакратара камітэта камсамола гістарычнага факультэта Р. МІСЮЧЭНКА, сакратар камітэта камсамола факультэта радыёфізікі і электронікі А. ЧУЛКОЎ, кіраўнік студэнцкага клуба факультэта прыкладной матэматыкі Э. РАБІНОВІЧ і намеснік сакратара камітэта камсамола геаграфічнага факультэта Л. СТАРАВОЙТАВА.

Па абмеркаванаму пытанню сход актыву камсамольскай арганізацыі універсітэта прыняў адпаведную пастанову.

**Л. МАРЦЫЁНКА.**



**Цікава праходзяць заняткі ў лабараторыі оптыка-электронных сістэм кафедры фізічнай оптыкі фізфака.**
**НА ЗДЫМКУ: чарговы вопыт пад кіраўніцтвам малодшага навуковага супрацоўніка В. МАШЧАНКІ праводзіць студэнт IV курса Уладзімір ЦВІРКО [на пярэднім плане].**

Фота **В. Шачака.**

● РЭПАРТАЖ

## ПРАКТЫКУМ...

НЯЗВЫКЛЫ для стандартнага ўяўлення аб навучальным працэсе паўзмрок. Толькі настольныя лямпы графічна акрэсліваюць сілуэты студэнтаў ля прылад і прыстасаванняў. Тут, у вучэбнай лабараторыі, дзе праходзіць практыкум па оптыцы, матэрыялізавалася для мяне незнаёмае гуманітарыям і ўласцівае прыродазнаўцам кароценькае слоўца са студэнцкага лексікона — лабы.

— У лабараторнай рабоце № 4 «Вывучэнне спектра ртутнай лямпы пры дапамозе дыфракцыйнай рашоткі» патрабуецца вызначыць даўжыню хвалі ў спектры ртуці, азнаёміцца з характарыстыкамі спектральных прылад, вылічыць вуглавую і абаротную лінейную дыспрэсію, — расказвае другакурснік фізфака Аляксандр Галаваты. Затым ледзь паварочвае апраўу лінзы. Фіялетавыя, жоўтыя, сінія лініі змяняюць адна адну ў акенцы акуляра. Прыгожа! А ў сшытку з апісаннем работы— калонкі лічбаў, формулы. У навукі свае меркаванні аб прыгажосці.

— Ці цікава? — здзіўляецца Саша наіўнасці пытання.— На трэцім курсе ў нас размеркаванне па кафедрах. Я мару займацца квантавай спектраскапіяй. А там без оптыкі не абысціся.

Зрабіць лабараторную —палова справы. Яе яшчэ трэба здаць, ці, лепш сказаць,— абараніць.

Круг святла на стале асістэнта кафедры агульнай фізікі Г. М. Сіцко, які вядзе практыкум па оптыцы ў студэнтаў шостай групы II курса, выхоплівае з паўзмроку аркуш паперы. Ігар Мурох малюе побач з формуламі ручай і каменьчык на дне яго.

— Дык чаму ж каменьчык у празрыстым ручаі здаецца нам больш блізкім да паверхні?

Дакладны чарцёж перакрэслівае малюнак. Адказ верны.

— Але здараецца, што Генадзь Мікалаевіч адпраўляе ў бібліятэку дачытаць тэорыю, каб змаглі разабрацца з такімі вось «звычайнымі» пытаннямі,— каменціруе Людміла Шыбалка. Яна чаруе над лабараторнай № 15. Не адразу атрымліваецца, каб ярка-чырвоная нітка піраметра злілася па колеру з распаленай нікелевай пласцінкай. Люда запісвае паказанні амперметра, вылічвае яркасную тэмпературу, вылічвае па формуле тэмпературу сапраўдную. Яе задача— вызначыць «пастаянную Стэфана Больцмана».

Генадзь Мікалаевіч тым часам распісваецца ў залікоўцы Аляксандра Манькоўскага, які сёння «развітаўся» з лабараторнымі. Атрымала ўжо залік па фізпрактыкуму студэнтка з Кубы Саланелас Рохас Марыя Хулія. Схіліўся над мікраскопам Леанід Паплаўскі, апісвае зробленую работу Вольга Чайкоўская, старонкі «Оптыкі» Ландсберга перагортвае Дзмітрый Русецкі, рыхтуецца адказваць Іосіф Казімірчык. Другакурснікі ведаюць: таму, хто больш сур'ёзна аднясецца да практыкуму, значна лягчэй будзе здаваць недалёкі ўжо экзамен.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

РАШЭННІ XXVI З'ЕЗДА КПСС — У ЖЫЦЦЁ!

# КЛОПАТ АБ НОВЫМ НАБОРЫ

ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ выхоўвае студэнцкую моладзь у духу высокай ідэйнасці, палітычнай свядомасці і творчай ініцыятывы. У 1980 годзе дыпломы аб вышэйшай адукацыі атрымалі 240 студэнтаў факультэта, якія зараз ужо ўліліся ў працоўныя калектывы. Усяго за гады дзесятай пяцігодкі ФПМ падрыхтаваў 1114 матэматыкаў-прыкладнікоў, спецыялістаў у галіне прымянення матэматычных метадаў рашэння і даследавання розных задач, якія ўзнікаюць у навуцы, тэхніцы і іншых галінах народнай гаспадаркі, з шырокім выкарыстаннем сучасных хуткадзеючых электронных вылічальных машын. Гэта спецыялісты, якія валодаюць глыбокімі ведамі па агульнаадукацыйных і спецыяльных матэматычных дысцыплінах, добра ведаюць магчымасці ЭВМ і могуць разам з прадстаўнікамі іншых спецыяльнасцей весці навукова-даледчую работу па складанню матэматычных мадэлей розных працэсаў, распрацоўцы алгарытмаў іх лічбавага рашэння на ЭВМ, а таксама па распрацоўцы матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання ЭВМ і праектаванне саміх АСК і іх комплексаў.

Зараз на нашым факультэце стаіць вострае пытанне аб новым папаўненні студэнтаў. Дэканат, партыйная арганізацыя з усёй адказнасцю ўсведамляюць, што важнейшай састаўной часткай дзейнасці факультэта павінна стаць камплектаванне чарговага набору. Падрыхтоўка да кожнага новага прыёму — гэта не сезонная кампанія, а паўсядзённая карпатлівая праца.

У мінулым годзе супрацоўнікамі факультэта шмат зроблена для больш арганізаванага і якаснага правядзення прыёму. Студэнцкая сям'я папоўнілася 325 першакурснікамі, сярод якіх 50 працэнтаў складаюць дзеці рабочых і калгаснікаў. Калі разгледзець якасны састаў абітурыентаў, то на факультэт залічана 114 медалістаў, 123 абітурыенты з сярэднім балам атэстата «5».

У мінулым навучальным годзе для лепшай арганізацыі новага набору рашэннем партыйнай арганізацыі і дэканата ўсе школы горада Мінска былі замацаваны за выкладчыкамі факультэта. Выкладчыкі выступалі з дакладамі аб матэматыцы, аб будучай рабоце матэматыка-прыкладніка, аб уступных экзаменах, прапаноўвалі конкурсныя задачы за мінулыя гады з аналізам рашэнняў.

Вялікую ролю ў прафесійнай арыентацыі і падрыхтоўцы да новага набору адыгрывае школа юнага праграміста. Дастаткова сказаць, што больш як 150 выпускнікоў школы за два мінулыя гады паступілі і займаюцца на факультэце. Лекцыі і практычныя заняткі ў школе праводзіць каля 30 выкладчыкаў кафедры агульнага праграміравання і вышэйшай матэматыкі. Вялікай папулярнасцю ў школе карыстаюцца канферэнцыі, якія праводзяцца навукова-тэхнічным таварыствам горада Мінска. Штогод больш як 20 прадстаўнікоў школы адзначаліся граматамі і падзякамі аддзела народнай асветы за актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Для расшырэння кантынгента слухачоў школы юнага праграміста і прыцягнення моладзі з сельскай мясцовасці ў 1978 годзе было адкрыта завочнае аддзяленне ў 20 цэнтрах, якія ўключалі ўсе абласныя і некаторыя раённыя гарады Беларусі. Школа юнага праграміста з'яўляецца самай шматлікай са школ юных не толькі ў нашым універсітэце, але і ў рэспубліцы. За пяцігадовы перыяд свайго існавання школу закончылі больш як 1000 школьнікаў.

Дэканат і партыйная арганізацыя і ў гэтым навучальным годзе шырока разгарнулі работу па новаму набору. Усе супрацоўнікі факультэта працуюць з пачуццём павышанай адказнасці, робяць усё неабходнае для далейшага паляпшэння падрыхтоўкі і камуністычнага выхавання спецыялістаў, каб з гонарам выканаць рашэнні XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

**А. САМУСЕНКА,**
**намеснік дэкана факультэта прыкладной матэматыкі, дацэнт.**

КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

# «Давайце азірнёмся, аднакурснікі!..»

АЗІРНЁМСЯ НАЗАД. Хаця б таму, што азірацца не ўваходзіць у нашы звычкі. Заўсёды спяшаемся, штосьці робім, жывём днём заўтрашнім. І ўсё ж азірнёмся. Дзе мы гублялі сябе? На станцыі пазнання? А можа тады, калі вялікая праўда самакрытыкі на 1-м курсе зменшылася, скруцілася і ператварылася ў шапаток у інтэрнацкіх калідорах?

Калі і дзе мы згубілі адзін аднаго? Мы — студэнты III курса факультэта журналістыкі. Нас 48 чалавек. І кожны дзень нас становіцца ўсё менш і менш.

Але, як ні дзіўна,назіраецца такая заканамернасць: адмяжоўваюцца тыя, хто і раней мала цікавіўся агульнымі справамі курса, а іншыя «дзівакі» і сёння працягваюць жыць жыццём курса. Ім не ўсё роўна, што будзе з намі — 48-ю заўтра, паслязаўтра, праз два гады.

Але вось бяда — у ядра таксама пачынае слабець яго прыцягальная сіла.

У чым жа справа?

Што нас аб'ядноўвала раней?

Навізна падзей: толькі адзін год студэнты. Інтэрнат: агульны дом. Пачуццё бязмежнай свабоды: рабі, што хочаш.

А яшчэ — працэс пазнання адзін аднаго.

Праходзіў час. І вось паціху наш курс пачынаў запаўняць чыстыя старонкі кнігі сваёй гісторыі. Першая «бульба», першая сесія, першы «агеньчык», першае вяселле. Гэтыя знамянальныя падзеі не адасаблялі нас, а наадварот — збліжалі. Пазнанне было за нас — агульнага станавілася ўсё больш, і нашы асобныя індывідуальнасці ўліваліся ў гэта агульнае.

Але вось «бульба» ўжо не першая, а трэцяя, і колькасць вяселляў набліжаецца да дзесятка, і ўжо амаль цалкам выяўлена «хто ёсць хто». Добра ведаем, як здаваць экзамены не рыхтуючыся, як рабіць адразу дзве справы: слухаць лекцыю і чытаць цікавую кніжку. Словам, студэнцкае жыццё страціла прывабнасць навізны: усе загадкі разгаданы.

І мы імкнёмся хутчэй развітацца, адседзеўшы 6 гадзін на лекцыях. А такое магло здарыцца значна пазней ці зусім не здарыцца, калі б мы не абыходзілі вострых вуглоў нашых адносін і не ўсміхаліся над суседам па парце, заўважаючы ў яго ўчынках толькі дрэннае.

...Мы не хочам успамінаць, няма калі, а ўспомніць трэба было б. Успомнім Валеру Мароза, які запасся на сельгасработы, як на Паўночны полюс. Мы смяяліся тады над ім: «Куды табе столькі?» А потым як добра пайшлі ў ход і яго рыбнае філе, і кансервы, і маміны піражкі, і нават шалік, якім ухутвалі горла, прастыўшы, усе нашы хлопцы.

Успомнім Борку Яўсейчыка, камісара, які не патураў нікому. І заўсёды апошнім пакідаў бульбяное поле.

Успомнім Ліду Серык, якая зграбней і шпарчэй за ўсіх працавала, але ніколі не імкнулася чымсьці выдзеліцца.

Успомнім Сашу Дашчынскага, рэдактара газеты, які заявіў журы: «Пакуль не прысвоіце нашай газеце першае месца, адсюль не выйдзеце».

Але вось прайшоў час, і замкнуўся ў сабе Бора Яўсейчык, адасобіўся ў чытальнай зале бібліятэкі Саша Дашчынскі.

А мы ўсе толькі дзіву даваліся: былі ж такія хлопцы, што з імі сталася? А ці не тады змяніўся Бора Яўсейчык, калі мы не хацелі заставацца на камсамольскі сход групы. І ён, камсорг, бачыў па нашых раўнадушных тварах: «Хутчэй бы ты заканчваў».

І ці не тады знік у бібліятэцы Саша Дашчынскі, калі адчуў, што да яго ставяцца як да лёгкадумнага і несур'ёзнага чалавека. А вечар, прысвечаны Аляксандру Блоку, даказаў, што Саша зусім не такі, якім мы яго сабе ўяўлялі...

Мы і цяпер збіраемся разам (хоць не так часта), а на «агеньчыкі», якія арганізуе наш курс, збіраецца ўвесь інтэрнат. Але ўсё часцей і часцей сталі гучаць на нашым курсе словы:

— Я адзінокі.

Гэта адсюль узнікае жаданне жыць сваім, асабістым жыццём, боязь падзяліцца сваімі марамі з таварышам — ведаюць наперад, што таварыш назаўтра ж абгаворыць пачутае з суседам па парце.

Што нас аб'ядноўвае цяпер:

— Жаданне высмеяць адзін аднаго. Нежаданне зразумець адзін аднаго. А мы ж — адзін калектыў. Гэта даказаў і «медыум» — свята ўсяго курса.

Мы ўспаміналі на рэпетыцыях мінулае: і зноў гучалі жарты і песні, прывезеныя з Красавіч (там былі на першай «бульбе»), і зноў нагадваліся вясёлыя здарэнні з нашага студэнцкага жыцця. Мы ўсе былі заняты адной, нашай агульнай справай — мы рыхтавалі медыум.

«Давайте жить, во всем друг другу потакая, тем более, что жизнь короткая такая». А гэта значыць — давайце быць уважлівымі адзін да аднаго, давайце адносіцца паблажліва да слабасцей сяброў і не будзем злапамятнымі.

Давайце азірнёмся...

**А. СУХОЦКАЯ.**

# ТАКІ ЯГО ШЛЯХ

**На факультэце журналістыкі займаюцца студэнты больш чым з дваццаці краін свету. Сярод іх ёсць многа такіх, якія са зброяй у руках змагаліся за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы. З далёкага і гераічнага В'етнама прыехаў да нас вучыцца Зыонг Шон.**

Цішыня. Адкрыем дзверы аўдыторыі, дзе старанна працуюць студэнты. Знаёмы твар Шона. Ён нешта піша, час ад часу падымаючы галаву. З вуліцы даносіцца гул аўтамашын, скрып пад'ёмных кранаў, якія працуюць на будаўніцтве падземнага пераходу. Падняўшы галаву і адклаўшы ў бок ручку, Шон аб нечым задумаўся. Можа, успамінае бацькоў і сяброў на радзіме, а можа—сваё дзяцінства і мару стаць журналістам.

Дзесяты клас. Апошні званок адкрывае шлях да прафесіі, якую ты выбіраеш на ўсё жыццё. Але не давялося Шону паступіць вучыцца ў той год. Пачалася вайна з амерыканскімі захопнікамі.

Чатыры месяцы правёў юнак у вучэбным атрадзе, дзе яго рыхтавалі камандзірам артылерыйскай устаноўкі. Выпускалі датэрмінова — арміі патрэбны малодшыя камандзіры.

Падраздзяленне, у якое быў накіраваны Зыонг Шон, ваявала ў гэты час на поўдні. Не паспеў яшчэ як след разабрацца са сваімі абавязкамі, як атрымаў першае баявое заданне.

На досвітку нібы гром грукатаў над зямлёй, стралялі гарматы розных калібраў. Адна частка байцоў абслугоўвала артылерыйскія ўстаноўкі, а другая, у якой быў і Шон, прабіралася да маста. Бой закончыўся перамогай. За мужнасць, праяўленую ў першым баі, камандзір дывізіі аб'явіў падзяку Шону і ўручыў яму Ганаровую грамату.

...А можа, ён успамінае той дзень, калі атрымаў ордэн Перамогі.

Узводу, у якім служыў Шон, было даручана любой цаной захапіць важны абаронны рубеж праціўніка. Ціха, без шораху, падышлі да падножжа гары, але з-за памылкі аднаго таварыша ворагі заўважылі іх і адкрылі агонь. Адступаць было ўжо некуды...

У гэтым баі Шона цяжка паранілі. Шмат часу ён знаходзіўся ў шпіталі, дзе і сустрэў радасны, доўгачаканы дзень перамогі.

...Зараз Зыонг Шон займаецца на першым курсе факультэта журналістыкі БДУ, займаецца так, каб не было сорамна глядзець у вочы сваім сябрам —на выдатна.

**Б. САЧАНКА.**

РАСКАЖУ ПРА ТАВАРЫША

ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

# ДАСЛЕДЧЫКІ РОДНАЙ ГІСТОРЫІ

ЗНАЧНАЯ роля ў фарміраванні навуковых поглядаў будучых спецыялістаў належыць факультэцкім кафедрам, у тым ліку і кафедры гісторыі БССР. Заснавана яна ў верасні 1958 года.

Сёння на кафедры навуковую, выкладчыцкую і выхаваўчую работу вядуць 8 выкладчыкаў, сярод якіх дактары гістарычных навук, прафесары В. В. Чапко (загадчык кафедры), А. П. Ігнаценка, Д. Б. Мельцар. У сферу навуковых інтарэсаў супрацоўнікаў кафедры ўваходзіць шырокае кола пытанняў аб развіцці і ўтварэнні нашай рэспублікі, крытыка буржуазнай фальсіфікацыі гісторыі БССР, праблемы барацьбы беларускага народа за аб'яднанне з Расіяй, беларуска-балгарскія і савецка-балгарскія адносіны, сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі і інш.

Кафедра вядзе актыўную грамадскую работу. Па-за універсітэтам вядомы традыцыйныя балгара-савецкія канферэнцыі, канферэнцыі чытачоў па кнігах военачальнікаў і беларускіх пісьменнікаў. Таму вельмі заканамерны рост папулярнасці кафедры. Аб гэтым гаворыць тое, што ў цяперашні час тут спецыялізуецца 120 студэнтаў. Тых, хто жадае пісаць дыпломныя работы па гісторыі БССР, звычайна бывае ў 3 разы больш, чым можа прыняць кафедра.

Многія студэнты паспяхова працуюць над напісаннем гістарычных нарысаў гарадоў Беларусі. Гэтыя даследаванні стануць часткай фундаментальнай працы па гісторыі гарадоў і вёсак нашай рэспублікі.

У калектыва кафедры гісторыі БССР цікавыя творчыя планы і ўсе магчымасці для плённых гістарычных даследаванняў.

**В. ВАБІШЧЭВІЧ,**
**студэнт IV курса гістфака.**



У чытальнай зале бібліятэкі БДУ. Фота В. Шачака.



Дачытваюцца апошнія лекцыі, заканчваюцца семінарскія і практычныя заняткі. Ва універсітэт прыйшла сесія з яе кансультацыямі, залікамі і экзаменамі. Для першакурснікаў яна ўжо другая па ліку, таму паявілася больш упэўненасці ў сваіх сілах.

НА ЗДЫМКУ: першакурсніца вытворчага патоку хімічнага факультэта, праформ другой групы, член рэдкалегіі насценгазеты «Хімік» Люда ГУЛЯКЕВІЧ у час падрыхтоўкі да заліку.

Фота В. Шачака.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# На вахце ведаў

ЗАКОНЧЫЎСЯ працоўны дзень. Змоўклі тэлефонныя званкі, шчыльна зачынены дзверы аддзелаў бібліятэкі. Не пустуе толькі чытальная зала, ды вось яшчэ гарыць святло ў кабінеце дырэктара Ірыны Уладзіміраўны Арэхоўскай. Штосьці трэба дапрацаваць, прадумаць план на заўтра — гэта толькі здаецца, што дзень гэтакі доўгі...

Вось ужо дзесяць гадоў запар аддае свае сілы, веды і вопыт гэта прыемная, строгая на першы погляд жанчына любімай справе. Бібліятэка — гэта яе другі дом, і ўсе клопаты і думкі — аб ім. Як высокакваліфікаваны спецыяліст, умелы арганізатар, яна нямала зрабіла дзеля таго, каб бібліятэка БДУ імя У. І. Леніна стала адной з лепшых вузаўскіх бібліятэк рэспублікі. Пад кіраўніцтвам Ірыны Уладзіміраўны тут укаранёны групавое абслугоўванне і групавы прыём вучэбнай літаратуры, што значна эканоміць час, уведзена бібліятэчна - бібліяграфічная класіфікацыя па грамадска-гуманітарных навуках — гэта палепшыла даведачна-пошукавы апарат бібліятэкі і акрэсліла напрамак у навукова-даследчай рабоце.

Жанчына нястрымнай энергіі, Ірына Уладзіміраўна пастаянна адшуквае новыя эфектыўныя формы і метады работы, што садзейнічае ўдасканаленню структуры бібліятэкі. Пры яе непасрэднай дапамозе ва універсітэцкай бібліятэцы арганізаваны аддзелы рэдкай і каштоўнай кнігі, масавай работы, бібліятэкі на філалагічным і факультэце радыёфізікі і электронікі. Усё гэта ствараецца з мэтай павышэння культуры абслугоўвання чытачоў. Немалая заслуга дырэктара і ў тым, што за пяць апошніх гадоў бібліятэка БДУ аформілася як метадычны цэнтр сярод бібліятэк ВНУ рэспублікі.

Добра ведаючы справу, бібліятэчныя патрэбы, І. У. Арэхоўская шмат часу аддае грамадскай рабоце. Яна і намеснік старшыні Рэспубліканскай навукова-метадычнай камісіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, і член цэнтральнай навукова-метадычнай бібліятэчнай камісіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР... Яна паспявае выступаць на прадстаўнічых нарадах і абменьвацца вопытам з калегамі з іншых бібліятэк. У той жа час Ірына Уладзіміраўна надзвычай добры, чулы і надзейны памочнік ва ўсім. Парады старэйшага, вопытнага работніка вельмі дапамагаюць маладым супрацоўнікам бібліятэкі.

З такім чалавекам, як Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская, прыемна працаваць. Ёсць у ёй нейкі запал, які перадаецца іншым, побач з ёй, яе натхнёнасцю, высокім інтэлектам, разнастайным і багатым унутраным светам хочацца і самому быць прыгажэй, працаваць лепш.

І. БАРДЗІЯН.

# ЛЕТАПІС БДУ

(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8, 10—18).

**1966 год**

**Снежань**

На першым Усесаюзным злёце студэнцкіх будаўнічых атрадаў у Маскве універсітэт занесены ў Летапіс рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы ЦК ВЛКСМ.

Камітэт камсамола звярнуўся да ўсіх студэнтаў і супрацоўнікаў з заклікам актыўна ўдзельнічаць у арганізацыі клуба рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы і яго музея.

Падпісаны дагавор аб навуковым і культурным супрацоўніцтве паміж Белдзяржуніверсітэтам імя У. І. Леніна і Сафійскім універсітэтам імя К. Ахрыдскага (НРБ).

**15 снежня**

Увайшоў у строй вучэбны корпус радыёфізікі.

**1967 год**

**7 студзеня**

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Люты**

На ўсіх факультэтах уведзены дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму.

Пачаў работу факультэт павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін вышэйшых навучальных устаноў.

**Сакавік**

Ва універсітэце ствараецца фотаклуб.

**25 кастрычніка**

Навуковая канферэнцыя універсітэта, прысвечаная 450-годдзю беларускага кнігадрукавання.

**31 кастрычніка**

Падпісаны дагавор аб навуковым і культурным супрацоўніцтве з Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (ГДР).

Калектыў народнага аркестра народных інструментаў, народная харавая капэла сталі лаўрэатамі і ўзнагароджаны дыпломамі Усесаюзнага фестывалю-конкурсу самадзейнага мастацтва.

Камітэт камсамола аб'явіў прыём рабочых г. Мінска на курсы па падрыхтоўцы для паступлення ў БДУ, арганізаваныя на грамадскіх пачатках.

**Лістапад**

Бібліятэка БДУ заняла першае месца ў аглядзе-конкурсе бібліятэк ВНУ і тэхнікумаў рэспублікі.

**Верасень**

На базе філалагічнага факультэта створаны факультэт журналістыкі.

Студэнт А. Гантварг упершыню заваяваў залаты медаль чэмпіёна рэспублікі па шашках.

**Снежань**

Універсітэт прызнаны лепшым па арганізацыі інтэрнацыянальнай работы ў выніку агляду, праведзенага Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у гонар 50-годдзя Савецкай улады.

Прафесару Т. Н. Годневу прысуджана прэмія АН СССР імя К. А. Ціміразева за манаграфію «Хларафіл, яго будова і ўтварэнне ў раслінах».

(Працяг будзе).

АБМЕН ВОПЫТАМ

# У ДЗЕЛАВОЙ АБСТАНОЎЦЫ

ДВА ДНІ ў актавай зале памяшкання ІПК выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін ВНУ працаваў Рэспубліканскі навукова-практычны семінар на тэму «Арганізацыя метадычнай работы вузаўскіх бібліятэк», арганізаваны Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР сумесна з бібліятэкай БДУ імя У. І. Леніна.

На ім, акрамя прадстаўнікоў бібліятэк рэспублікі, прысутнічалі госці з розных куткоў нашай краіны: спецыялісты з Масквы, Кіева, Саратава, Таліна, Краснадара, Вільнюса.

З уступнай прамовай выступіў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Ф. М. Капуцкі. Ён звярнуў увагу на важнасць арганізацыі семінара. Адзначыў, што «ніякі абмен дакументацыяй не можа замяніць адносін паміж калегамі». Супрацоўнікаў бібліятэк хвалююць пытанні метадычнай работы. Яна з'яўляецца адным з вядучых звенняў у рабоце бібліятэкі. Яе мэта — пошукі новых аптымальных форм работы ў даных умовах, метадаў рацыянальнай арганізацыі працы на ўсіх участках бібліятэчнай дзейнасці.

Дырэктары і загадчыкі бібліятэк ВНУ, загадчыкі аддзелаў, метадысты падзяліліся вопытам работы, сваімі дасягненнямі, планамі на будучае.

У заключэнне свайго выступлення А. В. Іванова, намеснік старшыні цэнтральнай навукова-метадычнай бібліятэчнай камісіі Мінвуза СССР падзякавала арганізатарам семінара і выказала надзею, што ён прынясе значную карысць яго ўдзельнікам.

В. ЛАПІКАЎ.

ПАТРЭБНА КОЖНАМУ

# Немагчымае — магчыма

ПРА «ІНФАРМАЦЫЙНЫ ВЫБУХ» шмат зараз гавораць і пішуць. Але хто, як не сённяшні студэнт, бадай, больш за многіх іншых адчувае вынікі гэтага «выбуху».

Успомнім вядомае прызнанне Ньютана: «Калі я бачыў далей, чым іншыя, то таму, што стаяў на плячах гігантаў». І не трэба асабліва растлумачваць, што прыступкі лесвіцы, якая вядзе да ўзроўню «плячэй гігантаў» — кнігі, шлях — чытанне.

Аб чым мы думаем, азіраючы багаж сваіх ведаў? Як мала прачытана! Колькі трэба яшчэ асіліць! На маўклівае пытанне, з якім стаім ля манбланаў выдавецкай прадукцыі, ёсць зараз канкрэтны адказ: выхад у павелічэнні хуткасці чытання. Звернемся да вопыту вялікіх.

«Чытаў Уладзімір Ільіч паасабліваму,—успамінае У. Бонч-Бруевіч.— Калі я бачыў чытаючага Леніна, мне здавалася, што ён не прачытвае радок за радком, глядзіць старонку за старонкай і хутка засвойвае ўсё вельмі глыбока і дакладна».

Вядома, што тэмп Напалеона — дзве тысячы слоў у мінуту, Бальзак чытаў удвая хутчэй. Тэадор Рузвельт любіў ставіць рэкорды. Аднойчы ён за гадзіну прачытаў тры раманы і падрабязна перадаў іх змест.

Навучанне паскоранаму чытанню ўзнікла ў Англіі пасля другой сусветнай вайны і хутка было распаўсюджана. Усё больш прыхільнікаў удасканалення працэсу чытання становіцца зараз і ў нас.

Пяцікурснік журфака Тадэуш Чарнавус прапаноўвае прачытаць газетны тэкст за мінуту:

— Колькі адолелі слоў? 200? 250? Нават 300? Дык гэта ж кропля ў параўнанні з тым, на што вы будзеце здольны, авалодаўшы тэхнікай паскоранага чытання. Толькі за сем тыдняў заняткаў мы засвойвалі ўжо да 500 слоў за кантрольны час.

— Усё ж не кожнага студэнта сёння патрэбна вучыць чытаць хутчэй. Мне даводзіцца сутыкацца і з тымі, хто сам, метадам спроб і памылак, навучыўся чытаць з хуткасцю ўдала прайшоўшага наш курс навучання, — удакладняе кіраўнік гуртка дынамічнага чытання, што працуе пры універсітэцкай кафедры псіхалогіі, Сталіна Пятроўна Цуранава.

Але такія выпадкі адзінкавыя. Па даных даследавання стану навыкаў чытання ў першакурснікаў інстытута народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава, якое было праведзена некалькі гадоў назад, толькі 40,7 працэнта студэнтаў паказалі здавальняючую хуткасць.

Зазірнём да тых, хто вырашыў навучыцца за адзін і той жа час чытаць удвая больш. Курс навучання разлічаны на 16 заняткаў працягласцю 45 мінут (па два разы ў тыдзень). Методыка навучання, распрацаваная Сталінай Пятроўнай, пабудавана на выключэнні мовы і слыху з працэсу чытання.

Як гэта робіцца?

Закончана сямімінутная размінка, неабходная для таго, каб сабрацца, засяродзіцца, «уключыцца» ў працэс навучання. Перад кожным членам гуртка спецыяльна падрыхтаваныя тэксты — кароткія газетныя паведамленні, наклееныя ў пэўным парадку.

— Закрываем далонню тэкст, — гаворыць Сталіна Пятроўна. Шчоўкае секундамер. Такія трэніроўкі дапамагаюць «схопліваць» адразу сэнс цэлага абзаца.

А вось яшчэ адно практыкаванне, сутнасць якога ў тым, каб адвучыць навучэнцаў прагаворваць пра сябе тэкст, які чытаецца. Асноўны памочнік на гэты раз — звычайны аловак, якім адстукваюць спецыяльны рытм. Аказваецца, аднačасовае пастукванне пры чытанні з прагаворваннем немагчыма. Шматразовыя паўтарэнні гэтага практыкавання, чаргаванне яго з іншымі вучаць чытаць без умяшання акртыкуляцыі.

Практыкаванні, тэсты, трэніроўкі. Кожныя чацвёртыя заняткі — кантрольныя.

— Значна лягчэй займацца тым, хто паверыць ва ўдасканаленне сваіх магчымасцей, захоча гэтага,— дзеліцца назіраннямі Сталіна Пятроўна.— І яшчэ: выдатна, калі ў групе ёсць эмацыянальны, захоплены чалавек, здольны «запаліць» прысутных ідэяй, у якой пераканаены сам. На такога раўняюцца астатнія. У нашым гуртку такім быў другакурснік вячэрняга аддзялення філасофіі Анатоль Пальчэўскі...

Біёлаг, фізік, філосаф, журналіст — прадстаўнікі розных факультэтаў, людзі розных інтарэсаў, розных характараў збіраліся кожны аўторак і чацвер у кабінеце псіхалогіі. Студэнту не так проста «выкраіць» сярод шматлікіх спраў гэтыя абавязковыя гадзіны. Але прапусціш раз, другі — і дагнаць групу амаль немагчыма...

Колькі вучняў (студэнтаў, школьнікаў, навуковых супрацоўнікаў) было ўжо ў Сталіны Пятроўны Цуранавай? Колькі тых, каму яна шчодра дарыла новыя магчымасці? Зараз іх больш як 120. Кожны новы навучальны год прыносіць новыя знаёмствы, новых жадаючых удасканальваць сябе.

— А што, Сталіна Пятроўна, калі ў наступным навучальным годзе па лініі факультэта грамадскіх прафесій падрыхтаваць інструктараў, якія змаглі б самі на кожным з факультэтаў весці гурткі паскоранага чытання,— прапаноўвае загадчык кафедры псіхалогіі Р. І. Вадэйка. І размова пераходзіць на ўдакладненне гэтай думкі, узгадненне планаў на будучае.

Зусім нядаўна праціўнікі паскоранага чытання абураліся: «Кашчунства чытаць хутка «как хороши, как свежи были розы».

Цяпер такіх галасоў усё менш. Можна дзесяткі раз перачытваць любімыя старонкі Талстога. Можна гадзінамі сядзець над Блокаўскім радком. Але каб вызваліць сабе час на паўнацэнныя зносіны з вялікай літаратурай — трэба навучыцца больш хутка і дасканала засвойваць штодзённую, неабходную нам інфармацыю. А колькі дадатковых магчымасцей для вучобы, для навуковай, даследчай работы тоіць у сабе гэта невялікае на першы погляд уменне — уменне чытаць хутчэй.

Т. САХАШЧЫК.

# Каб не быць «духоўным кватарантам»

ЗУСІМ нядаўна, спачатку ў часопісе «Маладосць», а пасля і асобным выданнем выйшла ў свет першая аповесць паэтэсы Раісы Баравіковай «Кватарантка». Заўсёды цікава, калі паэт спрабуе свае сілы ў прозе. Трэба адразу адзначыць, што спроба Раісы Баравіковай — удалая.

Адна з галоўных гераінь твора — Алёна Феафанава — паказана ў той час, калі яна ўступае ў новае, самастойнае жыццё. Пасля педінстытута Алёну накіроўваюць на працу ў вясковую школу. Пра адносіны бацькоў да гэтага накіравання аўтар гаворыць усяго адной фразай: «Дома трагедыя!» Сама ж Алёна любіць школу, любіць дзяцей, любіць сваю прафесію. І ўсё ж у самым пачатку перад намі раскрываецца яе нейкая раздвоенасць. Выхаванне паклала свой адбітак на яе разуменне шчасця. Быць шчаслівай — значыць выйсці замуж і застацца ў вялікім горадзе — так яна прывыкла лічыць.

Алёна едзе ў вёску, уключаецца ў школьнае жыццё, разам са школьнікамі ідзе ў паход па мясцінах баявой славы, прывучае дзяцей да роднай прыроды і нават «забывае» пра асабістае жыццё. Але хутка на яе шляху паўстаюць перашкоды: у школу вяртаецца былы выкладчык біялогіі, паважаны, заслужаны чалавек, і «дзяліць стаўку паміж ім і ёй не мае сэнсу». Алёне застаецца адно — група прадоўжанага дня. Яна не згодна. «Яе жыццё — гэта біялогія».

Як за нейкую выратавальную нітку хапаецца яна за вольнае месца біёлага ў Батанічным садзе. Мінск жа — не вёска. Тут і асабістае жыццё складаецца лепей, тым больш, што тут жыве чалавек, якога яна калісьці кахала. З ім у Алёны звязаны пэўныя надзеі. Але надзеі, як ілюзіі, — рушацца.

Што ёй застаецца рабіць? Біёлагам уладкавацца немагчыма. Ды яна ўжо не гаворыць, што любіць дзяцей, школу. Ёй бы толькі застацца ў Мінску. Яна згодна на любую прапанову і нават згодна працаваць выхавацелем у інтэрнаце.

Побач з вобразам Алёны ў аповесці даволі цікава раскрыты вобраз Вольгі. Яна, як і Алёна, вучылася ў Мінску і, напэўна, таксама хацела застацца ў сталіцы.

Але калі Алёна хоча толькі «жыць прыгожа», «жыць багатым жыццём», то Вользе прапанова працаваць у рэдакцыі адной з мінскіх газет дае магчымасць выявіць свае здольнасці, свой почырк. Яна адчувае, што знаходзіцца на сваім месцы, што тут яна прынясе больш карысці людзям. Вольга сумленны чалавек. Яна не можа ісці на кампраміс са сваім сумленнем. І нават калі просіць дырэктара школы ўладкаваць Алёну на працу, то ў гэтым праяўляецца яе чалавечнасць, прага дапамагчы, а не спроба пераступіць агульнапрынятыя нормы.

Кватарант... Якім павінен быць чалавек, каб не застацца назаўсёды «духоўным кватарантам»? Пісьменніца на гэтае пытанне прамога адказу не дае. І гэта можа і лепш. Кожны чалавек павінен знайсці мужнасць у сабе, каб стаць гаспадаром, а не кватарантам у жыцці.

**М. ХАУСТОВІЧ.**



«Добры дзень, сонца!»

Фотаэцюд В. ШАЧАКА.

# Споведзь шчырага сэрца

ЛЕТАСЬ у кнігарнях рэспублікі паявілася кніга вершаў Алеся Астапенкі (1920—1970 гг.) «Выпрабаванне». Мікола Аўрамчык так сказаў, вызначаючы творчасць паэта: «Усё лепшае з літаратурнай спадчыны Алеся Астапенкі — гэта песня шчырага сэрца, прызнанне ў любові да роднай зямлі. І гэта песня належыць беларускай савецкай паэзіі, яе чытачам».

Кніга складаецца з трох раздзелаў: «Гартаваныя полымем», «Дзень маёй Радзімы» і «Сэрца спявае». У першым раздзеле знайшла адлюстраванне вайна, у другім і трэцім —пасляваенная рэчаіснасць. У двух апошніх раздзелах ёсць таксама вершы на ваенную тэму, але яны ўспрымаюцца як успаміны, рэха вайны. Перад намі ўзнікае то вобраз шыняля паэта, на якім «пацалункі да слёз не астылі і зараз», то людзі з ордэнскімі стужкамі, то ўспаміны паэта аб тым страшэнным і грымоткім сорак першым...

Напад гітлераўцаў на нашу краіну перапыніў вучобу Алеся Астапенкі на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута. Спачатку ён працуе ў паходнай газеце «Савецкая Беларусь», а потым са зброяй у руках змагаецца на фронце, праходзіць праз усе цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на долю савецкага народа. Колькі разоў быў у такіх абставінах, што «думаў болей не жыць». Але Алесь Астапенка свята верыць у перамогу, хоць і ведае, што яна здзейсніцца не хутка і не проста:

...Хай растуць асіны ў нашым<br>
лесе,<br>
Будзе скора працы ім багата:<br>
Грымне дзень нястомнае<br>
расплаты,<br>
І на кожнай мы павесім ката.

«Выпрабаванне». Так, наш народ стаў перад вялікім выпрабаваннем, выпрабаваннем сваіх сіл, свайго светапогляду. З захаду шалёны вецер нянавісці прынёс свінцовую хмару фашызму, якая лінула крывавым дажджом на нашы палеткі і нівы.

Вельмі добра перададзены настрой лірычнага героя, яго псіхалогія ў той час, калі наша армія вымушана была часова адступіць:

Адыходзілі моўчкі<br>
Па любімай зямлі,<br>
Боль глыбока зацяўшы<br>
У сэрцах салдацкіх,<br>
Гарачэй ад спякоты<br>
Вочы сорам паліў:<br>
Дык няўжо нас асіліць<br>
Арда супастатаў?<br>
Як іголкай, калолі<br>
Людзі позіркам нас...

Улетку 1943 года гвардзеец-салдат А. Астапенка быў цяжка паранены пад Арлом. У вершы «Выпрабаванне», які быў напісаны ў шпіталі і які даў назву кнізе, ён гаворыць:

Усё аддаў для цябе,<br>
Каб ты зноў, Беларусь,<br>
красавала,<br>
Сілы — шумным лясам,<br>
Каб гулі ў вяках безупынна.

У гэтым вершы паэт выказаў жаданне не толькі сваё асабістае, але і кожнага савецкага чалавека.

Адгрымелі ваенныя грымоты... Удзельнікі бітвы вяртаюцца дадому пераможцамі. Але іх чакае не адпачынак, не спакой, а нястомная работа, толькі ўжо на працоўным фронце. Вораг жа пасля сябе пакінуў пустэчу:

Толькі к небу вярба адзінокая<br>
Абгарэлыя рукі ўзняла...<br>
...Даўно збуцвелі стрэхі хат,<br>
А ў дзірках столі неба стыне.

Але не будзе савецкі чалавек, нічога не рабіўшы, толькі гараваць на руінах. Паэт упэўнена гаворыць:

Раз пераможцамі прыйшлі<br>
Праз годы пекла к мірнай<br>
працы,<br>
Дык будзе шчасце на зямлі,<br>
Ад нашых рук яму ўзняцца.

Нізкі вершаў «Дзень маёй Радзімы» і «Сэрца спявае» напісаны адпаведна ў 1947—1951 і 1951—1959 гадах. Усе вершы прысвечаны пасляваеннаму аднаўленню. Паэт услаўляе мірную стваральную працу. Толькі дзе-нідзе ў плынь верша ўрываецца ваеннае рэха.

Гледзячы на адноўленую гаспадарку, на шчаслівыя твары людзей, паэт-франтавік ганарыўся тым, што кроў сваю ён праліваў недарма:

Іду я ў стройнай калоне<br>
І гонар у сэрцы гадую,<br>
Бо бачу на сцягу чырвоным<br>
Крыві сваёй кроплю жывую.

Вершы А. Астапенкі, напісаныя і ў грозныя ваенныя гады, і ў цяжкі пасляваенны перыяд, перадаюць настрой, атмасферу тых гадоў, паказваюць веліч чалавека савецкага —чалавека-барацьбіта, чалавека-працаўніка.

**М. КАРПЕЧАНКА.**

# З ТРЫВОГАЮ ПРА ЛЁС ЗЯМЛІ

ЧЫТАЛА новую паэму Генадзя Пашкова «Дзяўчынка з блакітным мячыкам» («Полымя», 1980, № 10) і ўяўляла гнуткую постаць блакітнай дзяўчынкі на блакітным шары з вядомай карціны Пікасо. Апрача блакітнай дзяўчынкі, блакітнага шара, на карціне недзе здалёк бачна блакітнае неба, а ўсё астатняе — шэрае, змярцвелае. Ні травінкі, ні дрэўца... І ўсё гэта так нагадвае тую спаленую Везувіем Пампею, пра якую гаворыць Пашкоў.

Не ведаю, ці прыгадалася паэту гэтая карціна Пікасо, калі ён пісаў сваю паэму, але я чамусьці без тоненькай блакітнай постаці на шары не ўяўляю паэмы Г. Пашкова. Мне здаецца, што блакітная дзяўчынка з карціны — гэта тая самая «маленькая шчабятушка» Наталет, якая бесклапотна гуляла з мячыкам у «незямной нямой пустэчы» спаленай Пампеі. Гэта тая самая дзяўчынка, якая ўвасабляе ўсіх дзяцей планеты Зямля, якіх аўтар пяшчотна назваў «маленькімі птушанятамі». Трывога за іх будучае падказала паэту сюжэт, вобразы-сімвалы, словы, якія «б'юць прама ў сэрца»:

Тут нават птушкі гнёздаў<br>
не віюць,<br>
арол мясціну гэту аблятае.<br>
І паспрабуй пяску рукой<br>
чарпнуць —<br>
дык і зямля тут нейкая не тая.<br>
Ну хоць бы дзе галінка ці<br>
сцябло,<br>
ці хоць бы ўбачыць<br>
парасончык кропу!<br>
І гэта ўсё,<br>
усё гэта было<br>
у самым цэнтры<br>
матухны Еўропы!

Аж па спіне пабеглі мурашкі... Так Г. Пашкоў апісвае Пампею. Успамінаецца міжволі «Анчар» Пушкіна:

Сюда и птица не летит<br>
И зверь не йдет...

Воблік спаленага мёртвага горада ў паэме нібы гаворыць людзям: «Такой можа стаць уся наша зямля, калі не знішчым атамнай пагрозы». А пагроза гэтая вісіць над чалавецтвам. Аўтар прыводзіць дакладныя лічбы: на кожнага чалавека сёння назапашана пятнаццаць тон ядзернай смерці. Паэтам знойдзена хвалюючая асацыяцыя: блакітны дзіцячы мячык — і наша планета. Асацыятыўная сувязь «планета-мяч» адчуваецца найбольш у тым эпізодзе, калі ашалелы вецер у час навальніцы выхапіў з рук малой дзяўчынкі блакітны мячык і кінуў яго «ў вадавей, у кіпень, у прастор.., дзе ўсё сякуць маланак вострых косы...»

Ад канкрэтнага выпадку з дзіцячым мячыкам Г. Пашкоў ідзе да маштабных абагульненняў агульначалавечага значэння:

Не толькі можа счэзнуць мяч<br>
малы—<br>
мацерыкі, абмытыя марамі,<br>
сагрэтыя праменнем і травой...

У паэме кантрасна супастаўляюцца Пампея і Зямля, дзе «ўсё жыве — звініць, плыве, калыша».

Шмат сонца, яркіх фарбаў паяўляецца ў тых радках паэмы, дзе Г. Пашкоў гаворыць пра сваю родную зямлю: «Зямля бацькоў!» — усхвалявана звяртаецца паэт да яе. Ён прыгадвае родную Прыпяць, дзе летам «бродзіць дух мядзвянае травы, дзе адкрываюцца душы тваёй і ветру зялёныя рачныя астравы».

Беларускае слова ў Г. Пашкова сакавітае, дакладнае, выразнае:

Слязінкі загарэліся ў вачах...<br>
Я суцяшаў,<br>
я выціраў дажджынкі,<br>
туліў камочак цёплы да пляча—<br>
маю сваволю,<br>
любую дзяўчынку.

Паэт натуральна пераключаецца з інтанацый задушэўных, лірычных на аратарскія, пафасныя. На хвалі вялікай эмацыянальнай узрушанасці гаворыць Г. Пашкоў пра тое, што «ў рурах зноў на танкі вараць сталь». У гэтых радках адчуваецца той жа актыўны грамадзянскі пратэст, што і ў паэмах П. Броўкі «Голас сэрца», М. Танка «Пражскі дзённік». У канцы паэмы публіцыстычная плынь становіцца ўсё больш адкрытай. Але шкада, што часам Г. Пашкоў ідзе шляхам спрошчанасці. Выпадковымі здаюцца ў паэме наступныя радкі:

Мы — моцныя.<br>
Спатрэбіцца калі,<br>
усе як ёсць<br>
мы стаць у строй гатовы...

Не варта было гаварыць пра тое, што і так зразумела, што сказана ўсім зместам твора.

Ёсць у паэме асобныя словы, сэнс якіх зразумець цяжка —«спраты», «вакаём туманны», «там калоцяць асіннік гарачыкі». Але, мусіць, такое заўважаеш таму, што ў цэлым паэма напісана добра. Гэты твор актуальны, у ім узнімаюцца пытанні сучаснасці, ён прымушае думаць, дае магчымасць адчуць чароўнасць роднай мовы, харавство жыцця.

**В. КАЎХУТА.**

**Старонку падрыхтаваў дацэнт**
**В. П. РАГОЙША.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

14 мая 1981 г.

Заказ 815. АТ 02258

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ